с армией надзирателей не отличается от труда рабов, за которыми следили жестокие надсмотрщики. Роман начинается с поездки Леони в Парчмен забрать выходящего на свободу мужа. Это путешествие, в которое она берет своих детей и подругу, становится дорогой в ад, где всех ждет множество драматических испытаний. Леони хочется полной семьи в надежде, что она будет, как все обычные семьи, где родители заботятся о детях, а дети любят родителей, где царят покой и мир. Этого не происходит. Даже не вполне понимая происходящее, сын не может смириться с поведением матери. Оба родителя пристрастились к наркотикам – это их злосчастная судьба, над которой они не могут подняться, и это одно из их проклятий. Их тянет прошлое, напоминающее о себе и в поведении белого полицейского, останавливающего их по дороге из тюрьмы и напоминающего сцену из болдуиновского романа «Иди, вещай с горы», и в откровенной ненависти белых родителей Майкла, и в появлении призраков из трагических историй, навсегда определивших их настоящее. Коллективная память на бессознательном уровне хранит границу между «белым» и «черным» миром, преступить который даже в начале нового века чревато негативными последствиями. Сплетая лоскутное одеяло из историй этого путешествия, рассказанного разными повествователями, среди которых взрослые и тринадцатилетний мальчик, вводя фигуры призраков, предстающих перед взором сына и матери, обогащая роман элементами магического реализма, экспериментируя с пространством и временем, Уорд создает многоуровневое произведение, сочетающее жесткий реализм в описании повседневной действительности и синкретизм магического реализма, включая фантастические сцены общения живых и умерших «певцов», «не погребенных», как говорится в заглавии книги.

**В. А. Судлянкова**

## МАТЫЎ ТРАЎМЫ Ў РАМАНЕ Л. РУБЛЕЎСКАЙ «ДАГЕРАТЫП»

Тэарэтычныя даследаванні пра культурныя і этычныя бакі траўматычнай тэматыкі ў мастацтве пачалі інтэнсіўна развівацца толькі ў канцы XX стагоддзя, але літаратурная практыка, г.зн. адлюстраванне розных траўматычных выпадкаў у мастацкіх творах пачалося раней, прынамсі пасля Першай сусветнай вайны, асабліва ў творчасці мадэрністаў, напрыклад, у раманах Вірджыніі Вулф і Уільяма Фолкнера. Розныя псіхалагічныя траўмы прысутнічаюць у творах сучасных аўтараў, нават калі яны не робяць гэтага мэтанакіравана.

Матыў траўмы праходзіць праз увесь раман сучаснай беларускай пісьменніцы Людмілы Рублеўскай «Дагератып», бо ўсе пяцёра галоўных герояў твора маюць нейкі траўматычны досвід. Трое з іх перажылі яго ў дзяцінстве, і драматычныя, альбо нават трагічныя, падзеі аказалі ўздзеянне

на іх далейшы лёс. Матыў траўмы з'яўляецца у рамане адным з «устойлівых ідэйна-тэматычных ці вобразна-эмацыянальных кампанентаў, прадвызначаных колам жыццёвых абставін», як апісвае паняцце матыву В. Рагойша.

Раман мае рамачную структуру – у ім два часовыя планы, якія сама пісьменніца пазначыла як «Кніга знешняга кола» і «Кніга ўнутранага кола». Дзея «знешняга кола» адбываецца ў наш час, і героямі яго з'яўляюцца нашы сучаснікі – маладая журналістка Сімка і Гальяш, малады біёлаг, якія жывуць у Мінску. Сярод старых дзядуліных рэчаў яны находзяць фатаграфію маладой прыгожай кабеты і запісы, якія, як яны разумеюць, належаць ёй. Маладыя людзі вырашаюць паехаць і на свае вочы пабачыць той самы маёнтак Жухавічы, што апісваецца ў запісах жанчыны (яна, як высвятляецца, з'яўляецца прабабуляй Гальяша) і які калісьці належыў яго прадзядулі. Пра прыгоды маладых людзей пад час гэтай вандроўкі распавядае другая частка «Кнігі знешняга кола». А падзеі, апісаныя ў запісах прабабулі, складаюць «Кнігу ўнутранага Кола».

Падзеі «Кнігі ўнутранага кола» адбываюцца на Беларусі ў 1893 годзе. Галоўнымі героямі з'яўляюцца фатограф Варакса Ніхель, яго прыёмная дачка Багуслава і граф Шыман Каганецкі, знакаміты венскі прафесар заалогіі, нашчадак шляхецкай сям'і і ўладальнік маёнтка Жухавічы. Усе трое перажылі у дзяцінстве траўмы, якія аказалі ўплыў на іх характары і далейшы лёс.

Варакса Ніхель у дзяцінстве стаў сведкам несправядлівых і жорсткіх адносін да яго бацькі з боку пьянага багатага пана, які абвінаваціў таго ў крадзяжы. І хоць пазней пан адазваў сваё абвінавачванне, бацька быў настолькі моцна збіты паліцыянтамі, што яго прынеслі дадому ў непрытомным стане. Эмацыянальная траўма, якую хлопчык тады перажыў, паклала адбітак на ўсё астатняе жыццё. Шок парадзіў у яго прагу помсты, жаданне адказваць насіллем на насілле і ператварыла яго ў бязлітаснага чалавека, які не спыніцца ні перад чым, каб дабіцца сацыяльнай справядлівасці. Гэта і прывяло яго ў рады тых, кто лічыў тэрарызм найлепшым сродкам барацьбы з прыгнётам. Усе яго ўчынкі былі накіраваны на дасягненне сацыяльнай роўнасці.

Яго прыёмная дачка Багуслава таксама перажыла ў дзяцінстве эмацыянальную траўму. Ніхель знайшоў яе ў пансіёне як раз у той момант, калі яна, 13-гадовая сірата, дачка польскага патрыёта, сасланага у Сібір, даведзеная да адчаю абразамі з боку іншых дзяўчынак, накінулася на адну з іх з такой сілай, што тая ўпала і згубіла прытомнасць. Выгляд ахвяры, якую, як падалося Багуславе, яна забіла насмерць, будзе стаяць перад вачыма і не будзе даваць ёй спакою. Ніхель па-майстэрску скарыстаўся гэтым станам дзяўчынкі, пахваліўшы яе і прапанаваўшы сваю ахову. Пад яго ўплывам Багуслава авалодала рознымі ўменнямі, неабходнымі для таго, каб рыхтаваць і выконваць тэрарыстычныя акты. Яму, умеламу псіхолагу і маніпулятару, удалося скіраваць яе пастаяннае пачуццё віны ў перакананне, што іх здзяйсненне і ёсць яе місія, яе ўнёсак у барацьбу за справядлівасць.

Тая лінія рамана, якая тычыцца Шымана Каганецкага, мае містычны налёт. Ён таксама ў дзяцінстве перанёс траўму, але больш скаладаную, бо тут эмацыйны шок спалучаўся з фізічным і прывёў да псіхічных зрухаў, якія выклікалі эпілепсію, а потым і псіхоз. Ва ўзросце пяці гадоў на яго і ягоную маці напалі ваўкі. Яны забілі маці і паранілі хлопчыка. Менавіта гэты выпадак парадзіў легенду аб тым, што нібыта на графа напаў ваўкалак. А па павер’ях, чалавек, які меў зносіны з ваўкалакам, можа сам час ад часу ператварацца ў такую істоту. Маніпуляцыямі і падманам доктара і яго сястры родзічам Шыманавага бацькі ўдалося заставіць графа паверыць, што кожны год у дзень, калі яго маці загрызлі ваўкі, ён ператвараецца ў ваўкалака і забівае людзей; ён нібыта нават забіў роднага бацьку. Яны настаялі на тым, каб у такія дні Шыман прыязджаў у маёнтак і зачыняўся там, каб не нанесці нікому ніякай шкоды. Такімі маніпуляцыямі родзічы намагаліся змясціць Шымана ў псіхічную клініку і завалодаць Жухавічамі. Эпізоды, дзе Шыман хаваецца ў сутарэнні свайго маёнтка, зачыняецца ў клетцы, прывязаўшыся ланцугом, каб не паддацца прыпадку лікантропіі, надае раману містычны, гатычны прысмак.

Выпадак з Шыманам можа служыць ілюстрацыяй ідэі К. Юнга аб тым, што сутнасць неўроза нельга зразумець без уліку міфалогіі і гісторыі культуры. Л. Рублеўская дапаўняе аповед пра траўму Шымана народнымі беларускімі павер’ямі пра ваўкалакаў, накшталт таго, што чалавек, пакусаны ваўкалакам, можа сам ператварацца ў яго, што такое звычайна адбываецца ў ноч, калі на небе з’яўляецца поўня, што ваўкалака можна забіць толькі срэбранай куляй з выявай крыжа, што да ваўкалака можа вярнуцца чалавечае аблічча, калі на яго нехта накрычыць і г.д. Такім чынам, у рамане «Дагератып» фальклорныя легенды пра ваўкалакаў пераплецены з аповедам пра злачынствы, здраду, помсту і іншыя заганы.

Два маладых персанажы са «Знешняга кола» рамана таксама перажываюць эмацыйнае ўзрушэнне. Калі Гальяш і Сімка паехалі ў Жухавічы, каб паглядзець на былы маёнтак Шымона Каганецкага, на іх напалі тры маладзёны. Тут Л. Рублеўская зноў уплятае ў аповед матыў ваўкалацтва: Гальяш, які раней казаў Сімцы, што ён заўсёды дрэнна адчувае сябе ў ночы з поўняй і таму стараецца пазбягаць усялякіх канфрантацый з-за боязі праявіць агрэсію, зараз не мог устрымацца, бо то была якраз такая ноч. Ён з нялюдскай сілай накінуўся на адмарозкаў; яшчэ больш іх напужала гальяшава моцнае воўчае выццё, якое спынілася толькі тады, калі Сімка вярнула яго да рэчаіснасці. Менавіта тады Гальяш упершыню ўсвядоміў сваю спадчыннасць, пра якую тэарэтычна даведаўся за некалькі дзён раней з пісьмовага аповеда сваёй прабабулі Багуславы, і зразумеў сэнс выявы ваўка на сямейным гербе Каганецкіх.

Тое, што Гальяш даў волю свайму прыступу злосці, мела добры вынік, бо ён не толькі дапамог ім абоім пераадолець узрушэнне ад несправакаваных і агрэсіўных паводзін нахабных маладзёнаў, але і несумненна пазбавіў іх ад магчымых драматычных водгукаў у будучым. Шчаслівае заканчэнне інцы-

дэнту, адпор, што даў насільнікам Гальяш, дапамогуць ім пераадолець наступствы эмацыйнага шоку і, хутчэй за ўсё, ён не будзе мецъ для іх траўматычных наступстваў.

Такім чынам, у «Дагератыпе» Л. Рублеўская робіць ненаўмыснае, на наш погляд, але дакладнае літаратурнае даследаванне псіхічнай праблемы – траўмы і яе наступстваў, а таксама шляхоў іх перадольвання. У рамане прадстаўлены некалькі разнавіднасцей траўм, як фізічных, так і эмацыянальных, выкліканых рознымі прычынамі. Тры з іх былі вынікам драматычных альбо трагічных падзей, якія здарыліся з героямі рамана ў дзяцінстве. Эмацыянальныя ўзрушэнні, перажытыя Ніхелем і Багуславай, караніліся ў тагачаснай сацыяльна-палітычнай атмасферы, у той час як у выпадку Шымона Каганецкага прычынай траўмы стаў збег некалькіх фактараў – трагічнага выпадка, містычнай веры ў ваўкалакаў і нядобрасумленнай маніпуляцыі. Два маладыя героі, нашы сучаснікі, сталі ахвярай сягонняшняй атмасферы насілля і цынічнай веры некаторых людзей у перавагу сілы. Але, на шчасце, разам яны далі адпор насільнікам і змаглі пераадолець наступствы эмацыянальнага ўзрушэння.

**Яо Юань**

## «АМЕРИКАНСКАЯ МЕЧТА»: ПРОБЛЕМА ТЕРМИНОЛОГИИ

«Американская мечта» является национальным этосом американского народа и ядром духовных ценностей США, которые на протяжении столетий не только влияют на все стороны жизни американцев, но и глубоко воздействуют на экономику, культуру, политику и другие сферы. «Американская мечта» имеет важное значение для иммигрантов, привлекая их со всего мира переселяться в США и стимулируя осуществить эту мечту.

Однако каждый человек понимает «американскую мечту» по-своему, и четкого определения этой концепции не существует. Возникает проблема с терминологией. Следует рассмотреть различные определения «американской мечты» и ее составляющие.

Согласно определению «американской мечты», взятому из Кембриджского словаря, американская мечта – это «вера в то, что каждый человек в США имеет шанс быть успешным и счастливым, если он много работает».

Оксфордский словарь дает следующее объяснение: «американская мечта – это идеал, в котором равенство возможностей доступно любому американцу, позволяя достичь самых высоких устремлений и целей».

А определение данного термина в словаре «Вебстра» подчеркивает, что американская мечта – это «социальный идеал, делающий упор на эгалитаризме и особенно материальном процветании».

Согласно Словарю американского правительства и политики «...широко распространено мнение о том, что упорным трудом даже самые бедные и простые американцы могут достичь экономического успеха, лучшего образа жизни и повышения социального статуса в стране возможностей».